**Краіна замкаў і “куткоў мядзведжых”**

Прэс- і промтур для журналістаў і прадстаўнікоў турыстычных фірмаў “Новы погляд на агра- і экатурызм” праводзіўся ў межах праекта агенцтва ЗША па міжнароднаму развіццю (USAID) “Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё”. Афіцыйны старт праекта, рэалізацыя якога планавалася на тэрыторыі Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, адбыўся восенню 2012 года. Пасля вызначэння 16 турыстычных дэстынацый (тэрыторый), з якіх восем знаходзяцца на Гродзеншчыне, была распрацавана стратэгія ўстойлівага развіцця тут экатурызму. Праводзіліся шматлікія трэнінгі і конкурсы ініцыятыў, на мэце якіх было вызначэнне найбольш вартасных інавацыйных праектаў для іх фінансавай падтрымкі і ўвасаблення. Сярод пераможцаў Смаргонскага раёна - дэстынацыя “Паўночныя Афіны” і ўладальнік малога гранта - аграсядзіба “Віта”.



Для сапраўдных аматараў актыўнага агра- і экатурызму Наднёманскі край – скарбніца гісторыка-культурных артэфактаў, унікальнай прыроды і аўтэнтыкі. Пераканаліся ў гэтым удзельнікі прэстура, якія наведалі турыстычныя дэстынацыі “Мірскае графства” і “Паўночны вектар Гродзеншчыны”. У Карэліцкім раёне падарожнікі пабывалі ў турыстычнай вёсцы “Белыя лугі”. А на Ашмяншчыне іх чакала займальнае і змястоўнае падарожжа па маршруце “Шляхецкая ваколіца”, якое правёў кіраўнік фонду “Краіна замкаў” і гаспадар сядзібы ў Родзевічах Алесь Варыкіш. Распачаўся маршрут ад помніка археалогіі – Гальшанскага гарадзішча. Пры фінансавай дапамозе праекта тут удалося правесці добраўпарадкаванне і змайстраваць драўляныя прыступкі, якія вядуць на вяршыню гары, дзе ў старажытнасці стаяў замак князёў Гальшанскіх. Недалёка адсюль яшчэ адзін гісторыка-культурны помнік – пункт Дугі Струвэ “Тупішкі”, а ў Гальшанах – знакаміты замак Сапегаў, касцёл Святога Яна Хрысціцеля і кляштар, з якога па жартаўлівай заўвазе Алеся, сышоў некуды прывід, што доўгі час быў

турыстычным брэндам гэтай мясціны. Цяпер сумесна з мясцовым кіраўніцтвам пастаўшчыкі турыстычных паслуг шукаюць новы брэнд, хаця, калі шчыра, то яны тут на кожным кроку. Галоўнае – зрабіць ім добры піяр і стварыць адпаведныя ўмовы для аматараў-вандроўнікаў.



А самае цікавае чакала ўдзельнікаў прэстура наперадзе. Метадыст Ашмянскага цэнтра культуры Сяргей Жылін апавядаў пра гісторыю краю, пра перспектывы частковага аднаўлення Гальшанскага замка і пра святы ды анімацыю рыцарскіх турніраў, што ладзяцца каля яго сцен. Прыцягальнымі для падарожнікаў, айчынных і замежных, становяцца і аддаленыя ад шумнай цывілізацыі куточкі нашага краю. Менавіта ў гэтых затулках, па сцвярджэнню Алеся Варыкіша, захаваліся незвычайныя артэфакты старасветчыны. Да асобных з іх давялося ехацьляснымі шляхамі, куды турыстычны аўтобус не даедзе, затое для велападарожнікаў – асалода і ўзнагарода. Напрыклад, стары млын на беразе Ашмянкі або вязніца часоў Першай сусветнай вайны, або муры сядзіб колішняй засцянковай шляхты. Каля кожнага з гэтых, прыведзеных у нармальны выгляд рарытэтаў за сродкі праекта, устаноўлены турыстычныя стэнды.



Сапраўдная драма ў стылі шляхецкіх разборак разыгралася каля брамы хутара-аграсядзібы Родзевічы, дзе ўдзельнікі анімацыйнага клуба разам з гаспадаром сядзібы прадэманстравалі свае артыстычныя таленты. А ў гасцёўні ўжо чакала духмяная беларуская “бабка” і суп з бурачкоў.

На Смаргоншчыну падарожнікі прыехалі падвечар. На аграсядзібе “Віта” гасцей сустракала Алена Махнач і яе сыны Алег і Сяргей, якія правялі экскурсію і прадэманстравалі ў дзеянні набытыя на сродкі гранта рэчы: скаладром для аматараў экстрыму і жалезную клетку для ўтрымання мядзведзя. Праўда, мядзведзя трымаць тут забаронена, але для тых, хто цікавіцца гісторыяй смаргонскай школы, дзе дрэсіравалі гэтых звяроў, – цікавы ўзор. Прысутныя мінчане бралі каардынаты “Віты”, каб вярнуцца сюды не па службовых абавязках, а на адпачынак.

**Ала СТРАШЫНСКАЯ.**

**Фота аўтара.**

**Засцянковая шляхта змагаецца за чароўную пані.**

**Экстрым на скаладроме дэманструюць Алег і Сяргей МАХНАЧЫ.**